# Гуляў Міхайла па Міхайлаўцы

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Міхайла — усім святам запіхайла», — гэтак кажуць пра дзень 21 лістапада — Міхаіла-архангела — у народным календары.

У праваслаўных, і ў каталікоў пачынаецца калядны пост. У светлагорскай вёсцы Міхайлаўка ў гэты дзень з далёкіх часоў адзначалі напрастольнае свята. І цяпер людзі старэйшага ўзросту ўшаноўваюць Міхайлу — ходзяць у царкву, моляцца дома, стараюцца не выконваць без патрэбы цяжкую працу. Галоўнай падзеяй у гэты дзень было нашэнне абраза. Але названая ўрачыстасць не праводзілася з часоў вайны. Па-першае, старажытны абраз згарэў падчас яе, калі немцы палілі Міхайлаўку, а па-другое, новыя атэістычныя норавы не дазвалялі людзям адкрыта шанаваць святыні... Таму вёска гуляла Міхайлу без Міхайлы.

— Памятаю са свайго дзяцінства, як гэты дзень святкавалі: жыхары выходзілі на вуліцу, было шмат гасцей з іншых вёсак, весела ігралі гармонікі. А яшчэ быў кірмаш, — расказвае дырэктар Міхайлаўскага цэнтра культуры Наталля Мароз — адна з ініцыятараў адраджэння абраду пераносу іконы. — Таму хацелася б, каб з гэтым звычаем наша вёска вярнула сабе непаўторную адметнасць, а міхайлаўцы больш не забываліся на традыцыі і ганарыліся сваёй малой радзімай.







Гэтым разам ікону з выявай нябеснага апекуна вёскі прымала на сваім падворку колішняя вязніца нямецкіх лагераў. Увесь час, калі ікона толькі пачынала новае вандраванне, Лідзія Белая цярпліва чакала — дваццаць з гакам гадоў стаяла «ў чарзе». Яно і зразумела: традыцыя перадачы іконы ад суседа да суседа — доўгая ў часе, а баба Ліда жыве амаль у самым канцы населенага пункта.





Ікону па вёсцы, як у старажытнасці, носяць на руках. Гэтым разам ганаровую місію выконвалі пенсіянеркі Тамара Літвенка і Зінаіда Ручэня — старэйшыя дочкі Лідзіі Белай. Спачатку абраз вынеслі з дома, у якім Міхайла стаяў увесь год, пранеслі па ўсёй вуліцы да Дома культуры, які замяняе часам царкву. Потым прайшло невялікае набажэнства, якое правёў святар з Парычаў айцец Мікалай Бондараў, а вяскоўцы прыкладваліся да абраза, цалавалі яго, запальвалі свечкі. З цікавасцю слухалі пропаведзь святара. Пасля пілігрымы панеслі ікону ў двор бабы Ліды. Дарэчы, новага Міхайлу намаляваў мясцовы мастак. За гэты час вяскоўцы палюбілі абраз і шануюць яго як сваю святыню.

У гэты дзень Лідзія Пятроўна Белая не хавала слёз радасці, казала, што будзе не проста маліцца, а дзякаваць Богу за сваё доўгае жыццё, у якім давялося зведаць вайну. 11-гадовай дзяўчынкай яе пагналі на працу ў Германію, але яна выжыла і вярнулася ў спаленую вёску. Цяпер будзе прасіць Міхайлу, каб даў здароўя яе дзецям, унукам, праўнукам і прапраўнукам — а ўсяго ў бабы Ліды больш за... 40 (!) нашчадкаў.

**Анатоль КЛЯШЧУК.** *anatol@zviazda.by* **Фота аўтара.**

Усе здымкі гэтага фотарэпартажу можна паглядзець на сайце «Звязды».

---

**Крынічка**

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой зарослая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

**Узімку нават вынослівым раслінам бывае нялёгка, асабліва ў апошнія гады. Надвор'е стала зусім непрадказальным, абараняць свой сад і агарод ад яе капрызаў усё цяжэй.**

# МІФЫ АБ ЗІМОВЫМ УКРЫВАННІ РАСЛІН

## Міф 1: у схованцы маюць патрэбу ўсе расліны

Большасць шматгадовых раслін здольныя выдатна перазімаваць і без збудавання вакол іх дадатковых хованак — проста таму, што яны выдатна адаптаваныя да нашага клімату.

Вядома, ёсць не вельмі ўстойлівыя да капрызаў надвор'я віды, паклапаціцца пра якіх прыйдзецца: перш за ўсё, гэта ўсе віды руж (выключэнне складаюць толькі паркавыя), павойнікі, якія зацвітаюць на леташніх парастках, флоксы, півоні, лілеі, рададэндраны і г.д... але не перастарайцеся з накрываннем! Так, напрыклад, асноўная частка руж гіне не ад маразоў, а ад банальнага выправання — ці расліны былі накрыты занадта рана восенню, ці ўвесну, наадварот, раскрыты занадта позна.



## Міф 2: укрыванне расліны — гарантыя яго паспяховай зімоўкі

Многім даводзілася назіраць сумную карціну: здавалася б, старанна падрыхтаваныя да зімоўкі, добра накрытыя расліны гінуць па незразумелых прычынах. Чаму так адбываецца? Загінуць расліны могуць не столькі ад моцнага марозу, колькі ад рэзкай перамены тэмпературы, асабліва ў час восеньскіх і вясновых адліг.

Менавіта няўстойлівае надвор'е з рэзкімі перападамі тэмператур правакуе празмернае прамярзанне і пераўвільгатненне глебы. Вынік: розныя механічныя пашкоджанні раслін, загніванне іх каранёвай сістэмы, яе выправанне і, як наступства, — гібель. Памятайце: загінуць можа нават добра накрытая расліна!

**Што рабіць?**

✓ не ўспрымайце ўкрыванне раслін на зіму як панацэю. Гэта толькі адзін з метадаў, якія дапамагаюць павысіць зімаўстойлівасць раслін. Адзін, але не адзіны.

✓ займайцеся падрыхтоўкай раслін да зімоўкі комплексна: надайце ўвагу не толькі правільнай пасадцы раслін, але і іх своечасоваму паліванню, падкормцы ну і, вядома ж, накрыйце свае расліны, калі яны ў гэтым маюць патрэбу.

## Міф 3: акучванне зямлёй — дастатковы спосаб укрыцця нізкарослых раслін

Стварэнне над каранямі і рэшткамі сцёблаў расліны грудка з глебы — традыцыйны метад зімовага ўкрывання раслін. Дзякуючы акучванню мы не столькі абараняем расліны ад маразоў (хоць прамярзае глеба ў грудку сапраўды павольней), колькі ствараем вакол іх рэльеф глебы. За кошт гэтага рэльефу вясной лепш адводзяцца талыя вады, а сама расліна абаронена ад вымакання.

Старайцеся абганяць не звычайнай садовай зямлёй, а, напрыклад, перагноем. Ён мае больш рыхлую і лёгкую структуру, у параўнанні з зямлёй, не злежваецца, валодае больш высокай цеплаізаляцыяй і істотна павышае ўрадлівасць глебы, служачы не толькі добрым укрыццём, але і выдатным угнаеннем.

Трэба займацца падрыхтоўкай раслін да зімоўкі комплексна: акучылі, напрыклад, ружы — выдатна, але зрабіце над імі яшчэ нейкі будан. Ён стане надзейнай абаронай.

---

Даты | Падзеі | Людзі

**25 ЛІСТАПАДА**

**1714** год — нарадзіўся (Гродзеншчына) Тамаш Жаброўскі, беларускі архітэктар, матэматык. Прадстаўнік стылю барока. Вывучаў філасофію ў Віленскай езуіцкай акадэміі, матэматыку, фізіку, астраномію і архітэктуру ў Вене і Празе. Выкладаў у Віленскай езуіцкай акадэміі і Полацкім калегіуме. Сярод асноўных збудаванняў: езуіцкі касцёл у Бабруйску, касцёл святога Ігната і калегіум у Вільні і іншыя. Праектаваў палац Агінскага ў вёсцы Ручыца на Вілейшчыне. Памёр у 1758 годзе.

**1795** год — 220 гадоў таму кароль Польскі і вялікі князь Літоўскі Станіслаў Аўгуст Панятоўскі адрокся ад прастола на карысць расійскай імператрыцы Кацярыны II. Федэратыўная дзяржава Рэч Паспалітая і абедзве дзяржавы ў яе складзе — Каралеўства Польскае і Вялікае Княства Літоўскае — спынілі сваё дзяржаўнае існаванне.



**1905** год — 110 гадоў таму нарадзіўся беларускі паэт Змітрок Астапенка. Першы верш Змітрок надрукаваў ужо ў 16 гадоў... Яго паэтычныя зборнікі з'яўляліся адзін за адным: «На ўсход сонца», «Краіна», «Абураныя». Астапенка ўваходзіў у «Маладняк», затым — у БелАПП. На творчым вечары БелАПП 5 лютага 1931 г. Астапенку крытыкавалі за «панаванне інтымных матываў і захапленне прымітывам сялянскага жыцця». У 1933-м выкраслены з выдавецкіх планаў яго зборнік «Як шум дажджу» — на рукапісе застанецца надпіс «Забракавана». Астапенка ўдзельнічаў у Першым усесаюзным з'ездзе польскіх пісьменнікаў — ён выдатна валодаў польскай. І... планаваў уцёкі ў Заходнюю Беларусь, дзе «пісьменнік можа пісаць, што яму хочацца, а не выконваць сацыяльны заказ партыі» (так далажыць «у органы» хтосьці з агентаў). А яшчэ, згодна з агентурнымі даносамі, на кватэры Астапенкі «збіраліся пісьменнікі для праслухоўвання па радыё замежных перадач белагвардзейцаў-эмігрантаў». Ён быў арыштаваны 16 сакавіка 1933-га ў Мінску. Паэта «прывязалі» да справы «Беларускай народнай грамады» і асудзілі на 3 гады папраўча-працоўных работ. У турэмным вагоне яны ехалі разам: паэты Змітрок Астапенка, Сяргей Астрэйка, Уладзімір Дудзіцкі, Міхась Кавыль, Сцяпан Ліхадзіеўскі, Максім Лужанін, Юлій Таўбін, празаікі Змітро Віталіна, Лукаш Калюга, Мікола Нікановіч, перакладчык Сяргей Русаковіч, літаратурны крытык Уладзімір Сядура і іншыя. Неўзабаве двое з гэтага вагона апынуцца не ў лагерах, а на пасяленні. А потым — у Маскве. Гэта былі Максім Лужанін і Змітрок Астапенка. Тут ён жыў паўлегальна. Працаваў настаўнікам рускай мовы і літаратуры ў школе № 252. Пераклаў на беларускую мову раман «Маці» М. Горкага і іншыя творы. Загінуў на фронце ў 1944 годзе.

**Было сказана**

**Аркадзь КУЛЯШОЎ, народны паэт Беларусі:**

*«Раны гояцца часам, а дружбаю — гора».*

---

■ Не прапусці!

# ПА САМАЦВЕТЫ — У «КАМЕННУЮ КАЗКУ»

**Мінералагічная выстава-кірмаш «Каменная казка» адкрылася 24 лістапада ў галоўным корпусе Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.**

Яе праграма, як заўсёды, вельмі насычана і ўключае сустрэчы з калекцыянерамі, навукоўцамі і супрацоўнікамі геаграфічнага факультэта БДУ. У Музеі землязнаўства наведвальнікі змогуць азнаёміцца з эксклюзіўнай калекцыяй «Бразільскія аметысты», экспанатамі новага аддзела «Самацветы свету» і «Літафанія стагоддзяў». Акрамя таго, у рамках выставы будуць працаваць тэматычныя экспазіцыі. Так, у першы дзень «Каменнай казкі» адбудзецца адкрыццё экспазіцыі «Сінтэзіраваныя крышталі і імітацыі самацветаў». На 25 лістапада запланавана прэзентацыя экспазіцыі «Восеньская сімфонія ў камені». У гэты ж дзень адкрыецца і экспазіцыя фотавыставы «Мінулае і сучаснасць у летапісе Зямлі», якая складаецца з архіўных матэрыялаў Музея землязнаўства БДУ. А тых, хто аддае перавагу каралам у выглядзе ювелірных вырабаў, чакаюць на выставе 26 лістапада.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

---

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 8.54 | 16.58 | 8.04 |
| Віцебск | — 8.50 | 16.41 | 7.51 |
| Магілёў | — 8.44 | 16.48 | 8.04 |
| Гомель | — 8.34 | 16.52 | 8.18 |
| Гродна | — 9.08 | 17.15 | 8.07 |
| Брэст | — 9.02 | 17.22 | 8.20 |

**Месяц**

***Поўня ў 0.44.***
***Месяц у сузор'і Шаляў.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Аляксандра, Барыса, Івана, Канстанціна, Уладзіміра.*
***К.*** *Кацярыны, Марыі, Яўхіма.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




---

## УСМІХНЕМСЯ

— Як ты можаш біцца, калі нічога не бачыш без акуляраў?

— А я спачатку ўважліва гляджу, а потым б'ю па памяці.

**Аб'ява ў аптэцы: «Не возьмеш сёння прэзерватывы — прыйдзеш праз год па соскі!»**

— Ганна, дык вы згодны стаць маёй жонкай?

— Бора, неадкладна падніміцеся з каленяў, не пэцкайце нашы штаны!

**— Дзе спампаваць дыпломную працу зваршчыка?**

**— Дыпломную працу зваршчыка вараць. Пампуюць дыпломную шынамантажніка.**




caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.035. Індэкс 63850. Зак. № 4631.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 24 лістапада 2015 года.